# *Ратуемся спадчынай*

✓**25 мая** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі была прэзентаваная кніга **«Жывая традыцыя рамёстваў Беларусі»**. Ініцыятары і ўкладальнікі выдання – Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур і абласныя метадычныя цэнтры народнай творчасці. Дзякуючы іх супольнай працы атрымалася абагульніць каштоўны вопыт работы дамоў, цэнтраў рамёстваў і іх філіялаў, дамоў народнай творчасці і цэнтраў традыцыйнай народнай культуры, цэнтраў ткацтва і дамоў ганчароў, дзейнасць іх гурткоў і студый, сталых і маладых майстроў. Шматлікія ўзоры традыцыйнага народнага мастацтва захаваліся толькі дзякуючы дзейнасці цэнтраў і дамоў рамёстваў, што сабралі ўнікальныя калекцыі гука- і відэазапісаў, рукапісных і фотаматэрыялаў, калекцыі прадметаў народнага побыту і дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва. Гэтыя і іншыя інфармацыйныя, арганізацыйныя і метадычныя матэрыялы ўвайшлі ў двухтомнае выданне і з'яўляюцца каштоўным дапаможнікам усім зацікаўленым.

Выданне можна разглядаць як творчую справаздачу цэнтраў і дамоў рамёстваў, гісторыя існавання якіх пачалася ў 1990-я гг. і доўжыцца да сённяшняга дня. У прэзентацыі прынялі ўдзел генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Аксана Кіжнікава, доктар мастацтвазнаўства, старшыня Беларускага саюза майстроў народнай творчасці Яўген Сахута, дырэктар Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур Вольга Антоненка, а таксама прадстаўнікі бібліятэкі і творчага саюза, кіраўнікі абласных цэнтраў народнай творчасці, дамоў і цэнтраў рамёстваў.